РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**РАЗРЫ́Ў-ТРАВА́**, магічнае зелле, з дапамогай якога нібыта можна адамкнуць любыя замкі. Дзеля гэтага трэба было закласці Р.-т. пад разрэзаную на руцэ скуру і, прыклаўшы трыпутнік, загаіць рану, пасля чаго чалавек набываў здольнасць пры дакрананні да

замкоў адчыняць іх. Р.-т. можа плысці супраць плыні вады. Р.-т. ведаюць розныя птушкі. Яе ўжывае дзяцел, таму, каб здабыць яе, трэба абгарадзіць яго гняздо асінавымі пруткамі, і ён прынясе тую траву. Знайшоўшы гняздо інш. вешчых птушак (сарокі, савы, сойкі), замазваюць глінаю адтуліну, каб птушка не здолела да яго прабрацца, і пад тым дрэвам рассцілаюць абрус, схаваўшыся пад ім. У сваім імкненні вызваліць птушанят птушка паляціць па Р.-т. Пасля прыкладвання яе да гнязда замазка адваліцца і разам з ёю ўпадзе на абрус Р.-т. Падобнае, казалі, можна зрабіць і з вожыкам: абгарадзіўшы яго гняздо калкамі, трэба чакаць, калі ён прынясе зелле, ад якога калкі павылазяць.

*Літ*.: Богданович А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов: Этногр. очерк. Гродно, 1895. С. 31; Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 3. Зямная дарога ў вырай. Мн., 1999. С. 106—108.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ